# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК 323.1(476)«1934/1939»

**М.К. АЛЬХОВІК**, канд. гіст. навук, дацэнт
дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі
Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,
г. Мінск, Рэспубліка Беларус



*Статья поступила 3 мая 2023 г.*

## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ АДЗІНАК БССР У 1934–1939 ГГ.[1]

***Мэта:*** *вызначэнне прычын, этапаў і асаблівасцей працэсу рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак БССР у сярэдзіне – канцы 1930-х гг.*
***Матэрыялы і метады.*** *Пры падрыхтоўцы дадзенага артыкула быў выкарыстаны шырокі комплекс матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Метадалагічная аснова прадстаўлена сукупнасцю лагічных, агульнанавуковых і спецыяльна-гістарычных метадаў (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, абагульненне, параўнанне, гістарычны, лагічны, гісторыка-генетычны, канкрэтна-гістарычны метады і інш.).*
***Вынікі.*** *Устаноўлена, што ў кастрычніку 1934 г. – першай палове 1937 г. ліквідацыя нацыянальных саветаў не мела ўсёабдымнага маштабу. Савецкая ўлада не адмаўляла магчымасці існавання нацыянальных саветаў у месцах кампактнага пражывання палітычна лаяльнага насельніцтва з выразнай нацыянальнай і культурна-моўнай самаідэнтыфікацыяй. Аўтар прыйшоў да высновы аб тым, што з другой паловы 1937 г. працэс ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак як асяродкаў «антыдзяржаўнай работы» насіў паслядоўны і сістэмны характар. У ліпені – верасні 1937 г. былі ліквідаваны (рэарганізаваны) апошнія польскія саветы, у ліпені 1938 г. – красавіку 1939 г. – усе астатнія нацыянальныя саветы. Тэрыторыя Дзяржынскага польскага раёна была падзелена паміж суседнімі раёнамі.*
***Заключэнне****. Да сярэдзіны 1930-х гг. партыйна-савецкае кіраўніцтва прыйшло да высновы аб тым, што стварэнне нацыянальных раёнаў і саветаў садзейнічае канцэнтрацыі «антысавецкіх сіл». Знікненне нацыянальных асаблівасцей было аб'яўлена прагрэсіўнай з'явай і заканамерным вынікам сацыялістычнага будаўніцтва. Працэс ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у БССР праходзіў пад поўным кантролем ЦК УКП(б).*

***Ключавыя словы:*** *нацыянальная палітыка, нацыянальныя меншасці, нацыянальнае пытанне, нацыянальныя саветы, БССР.*

**ALKHOVIK M.K.,** PhD in Hist. Sc., Associate Professor
Assistant Professor in the Department of Philosophy and Political Science
Belarusian State Medical University, Minsk, Republic of Belarus

[1]Статья публикуется в авторской редакции.

# REORGANIZATION AND LIQUIDATION OF THE NATIONAL ADMINISTRATIVE-TERRITORIAL UNITS OF THE BSSR IN 1934–1939

***Objective:*** *determination of the causes, stages and features of the process of the reorganization and liquidation of the BSSR national administrative-territorial units in the mid-late 1930s.*
***Materials and methods.*** *Wide range of materials from the National Archive of the Republic of Belarus were used in the preparation of this article. The methodological basis is represented by a set of logical, general scientific and special historical methods (analysis, synthesis, induction, deduction, generalization, comparison, historical, logical, historical-genetic, concrete historical methods, etc.).*
***Results.*** *The article reveals that in October 1934 – the first half of 1937, the liquidation of the national councils did not have a comprehensive scale. Soviet power did not deny the possibility of the national councils' existence in the places of compact residence of a politically loyal population with a clear national and cultural-linguistic identity. The author came to the conclusion that since the second half of 1937, the process of liquidation of the national administrative-territorial units as hotbeds of the «anti-state work» was consistent and systematic. In July – September 1937 the last Polish councils, in July 1938 – April 1939 – all other national councils were liquidated (reorganized). The territory of the Dzerzhinsk Polish District was divided between neighboring districts.*
***Conclusion.*** *By the mid-1930s, party-Soviet leadership came to the conclusion that the creation of the national districts and councils contributes to the concentration of the «anti-Soviet forces». The disappearance of the national characteristics was declared a progressive phenomenon and a natural result of the socialist construction. The process of the liquidation of the national administrative-territorial units in the BSSR took place under the full control of the CC of the VKP(b).*

***Keywords:*** *national policy, national minorities, national issue, national councils, BSSR.*

**Навуковая навізна артыкула**

Упершыню праведзены комплексны аналіз працэсу рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак БССР. У артыкуле вызначаны прычыны рэарганізацыі і ліквідацыі шэрага польскіх і яўрэйскіх саветаў у перыяд актыўнага культурнага і гаспадарчага будаўніцтва сярод нацыянальных меншасцей БССР у другой палове 1920-х гг.
Раскрыта залежнасць рэспубліканскага кіраўніцтва ад рашэнняў саюзных улад у пытаннях функцыянавання нацыянальных саветаў і Дзяржынскага польскага раёна. Устаноўлена, што да сярэдзіны 1930-х гг. прадстаўнікі партыйна-савецкага кіраўніцтва прыйшлі да высновы аб тым, што нацыянальныя раёны і саветы садзейнічаюць канцэнтрацыі «антысавецкіх элементаў» і перашкаджаюць працэсам асіміляцыі нацыянальных меншасцей, якая была аб'яўлена прагрэсіўнай з'явай і заканамерным вынікам сацыялістычнага будаўніцтва. У артыкуле вызначаны і аб'ектыўныя прычыны ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак: пашырэнне рускай (беларускай) мовы сярод нацыянальных меншасцей, перавод работы дзяржаўных устаноў на рускую (беларускую) мову, змяншэнне долі небеларускага насельніцтва, неабходнасць ліквідацыі дробных і цераспалосна размешчаных нацыянальных саветаў.
Устаноўлена, што фармальным повадам для пачатку ліквідацыі нацыянальных саветаў у БССР стала разгортванне ЦК УКП(б) палітычнай кампаніі супраць «паланізацыі» беларускага насельніцтва. Асобная ўвага ў даследаванні акцэнтуецца на асаблівасцях правядзення і выніках абследаванняў нацыянальных саветаў. Выяўлены механізмы прыняцця рашэнняў аб рэарганізацыі (ліквідацыі) нацыянальных саветаў. У артыкуле вызначаны этапы ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак БССР. Даказана, што да сярэдзіны 1937 г. саюзныя, а таксама рэспубліканскія ўлады не мелі дакладнай стратэгіі ў адносінах да нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Паказана роля камісіі ЦК УКП(б) па праверцы рэспубліканскай партыйнай арганізацыі ў складзе Г. М. Малянкова і Я. А. Якаўлева ў ліквідацыі Дзяржынскага польскага раёна і апошніх польскіх сельсаветаў. Выяўлена, што працэс ліквідацыі яўрэйскіх сельскіх і местачковых саветаў паскорыўся пасля спынення існавання ў БССР яўрэйскіх школ.

**What this paper adds**

For the first time, a comprehensive analysis of the process of the reorganization and liquidation of the BSSR national administrative-territorial units was carried out. The article establishes the reasons for the reorganization and liquidation of a number of Polish and Jewish councils during the period of the active cultural and economic construction among the BSSR national minorities in the second half of the 1920s. The dependence of the Republican leadership on the decisions of the Union authorities on the functioning of the national councils and the Dzerzhinsk Polish district is revealed. It is established that by the mid-1930s, representatives of the party-Soviet leadership came to the conclusion that national districts and councils contribute to the concentration of «anti-Soviet elements» and hinder the processes of assimilation of national minorities which was declared a progressive phenomenon and a natural result of socialist construction. The article also identifies the objective reasons for the liquidation of the national administrative-territorial units: the spread of the Russian (Belarusian) language among the national minorities, the translation of the work of the state institutions into Russian (Belarusian), the reduction of the share of the non-Belarusian population, the need to eliminate small and interspersed national councils.

It was established that the formal reason for the beginning of the liquidation of the BSSR national councils was the deployment of a political campaign against the «Polonization» of the Belarusian population by the CC of the VKP(b). Particular attention in the research is focused on the specifics of the organization and the results of the surveys of the national councils. The decision-making mechanisms on reorganization (liquidation) of the national councils are identified. The article defines the stages of the liquidation of the BSSR national administrative-territorial units. It is proved that until the middle of 1937 Union and Republican authorities did not have a clear strategy in relation to the national administrative-territorial units. The role of the commission of the CC of the VKP(b) for the verification of the Republican party organization consisting of G. M. Malenkov and E. A. Yakovlev in the liquidation of the Dzerzhinsky Polish district and the last Polish village councils is shown. It is established that the process of liquidation of Jewish village and small town councils accelerated after the cessation of the BSSR Jewish schools.

**Уводзіны.** Адным з напрамкаў нацыянальнага будаўніцтва 1920-х – пачатку 1930-х гг. у СССР і БССР з’яўлялася стварэнне нацыянальных раёнаў і саветаў у месцах кампактнага рассялення прадстаўнікоў пэўных нацыянальнасцей. Нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі функцыянавалі як органы ўлады, якія ўлічвалі асаблівасці побыту і ўмовы жыцця мясцовага насельніцтва, арыентаваліся на забеспячэнне палітычнага, гаспадарчага і культурнага развіцця нацыянальных меншасцей, іх абслугоўванне на роднай мове і ўцягненне ў будаўніцтва сацыялізму. Змена падыходаў да вырашэння нацыянальнага пытання ў сярэдзіне – канцы 1930-х гг. прывяла да спынення існавання нацыянальных раёнаў і саветаў.

Першыя спробы аналізу працэсу і прычын ліквідацыі нацыянальных саветаў адносяцца да 1970-х – пачатку 1990-х гг. Савецкая гістарычная школа прытрымлівалася афіцыйнай дактрыны аб паслядоўным вырашэнні нацыянальнага пытання ў СССР і БССР, у сувязі з чым даследчыкі імкнуліся абгрунтаваць мэтазгоднасць ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак [0, с. 22–23; 0, с. 30; 0, с. 100–102; 0, с. 10, 12, 15, 17]. У сучаснай гістарыяграфіі назапашаны і апрацаваны каштоўны матэрыял па асобных аспектах праблемы [0; 0; 0; 0, с. 66–67, 73–74], аднак цэласная карціна ліквідацыі нацыянальных саветаў і Дзяржынскага польскага раёна адсутнічае.

**Асноўная частка.** Асобныя выпадкі рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных саветаў мелі месца яшчэ ў перыяд актыўнай культурнай і гаспадарчай работы сярод нацыянальных меншасцей, накіраванай на захаванне і ўмацаванне іх нацыянальнай ідэнтычнасці. Так, у 1926 г. былі рэарганізаваны ў беларускія Княжыцкі і Фашчаўскі польскія сельскія саветы Шклоўскага раёна, большасць насельніцтва якіх складалі беларусы-католікі. У 1929 г. Парыцкі, Капаткевіцкі 2-і, Тураўскі 1-ы яўрэйскія мястэчковыя саветы, Шацілавіцкі польска-яўрэйскі сельсавет былі пераўтвораны ў беларускія з-за змяншэння долі яўрэйскага насельніцтва. Некаторыя саветы былі аднаўлены ў якасці нацыянальных: у 1929 г. – Падасоўскі польскі сельсавет Ча-

чэрскага раёна (ліквідаваны ў 1927 г. акруговай Нацкамісіяй), 11 чэрвеня 1932 г. – Юркавіцкі польскі сельсавет Лагойскага раёна (рэарганізаваны ў 1925 г. у беларускі) [0, арк. 83–84].

У сярэдзіне 1930-х гг. нацыянальная асіміляцыя была абʼяўлена прагрэсіўнай зʼявай і заканамерным вынікам сацыялістычнага будаўніцтва. Падчас III Усерасійскай нарады работнікаў сярод нацыянальных меншасцей, якая адбылася 26–29 снежня 1933 г., загадчык Аддзела нацыянальнасцей Усерасійскага ЦВК Н. Н. Нурмакоў заявіў аб спыненні пашырэння сеткі нацыянальных раёнаў і саветаў [0, с. 81]. Праблемы саветызацыі нацыянальных меншасцей тлумачыліся тым, што іх установы і арганізацыі зʼяўляюцца спрыяльным асяроддзем для разгортвання «антысавецкай дзейнасці». У пастанове ЦК КП(б)Б ад 26 лютага 1934 г. «Аб працы нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў» указвалася, што значная іх частка «засмечана кулацкімі, класава-варожымі і антысавецкімі элементамі». У ліпені 1934 г. супрацоўнік БАН М. А. Поташ папярэджваў аб небяспецы «бундаўскай буржуазна-нацыяналістычнай аўтаноміі» ў шэрагу нацыянальных саветаў [0, с. 111].

26 ліпеня 1934 г. у пастанове «Аб рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР» ЦК УКП(б) асудзіў «насаджэнне ў раёнах і сёлах з большасцю беларускага насельніцтва польскіх школ і прымусовае навучанне дзяцей на польскай мове» і загадаў «перагледзець сетку і нацыянальны характар школ». 1 жніўня 1934 г. Палітбюро ЦК УКП(б) стварыла Камісію пад старшынствам члена ЦК УКП(б) А. І. Стэцкага для падрыхтоўкі «прапаноў аб польскіх раёнах і школах у УССР і БССР» [0, арк. 173].

Каб надаць ліквідацыі нацыянальных саветаў законны характар, камісіі ЦК КП(б)Б і СНК БССР з удзелам мясцовых работнікаў абследавалі дзяржаўныя, гаспадарчыя, культурна-асветныя ўстановы, правялі апытанні і гутаркі з грамадскасцю з мэтай выяўлення палітычных настрояў, адносін да рэлігіі, нацыянальнай прыналежнасці насельніцтва, моў, якая ўжываліся ў школах, у побыце, падчас грамадскіх сходаў і зносін з прадстаўнікамі ўлад [0, арк. 206]. Як адзначалася на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б 19 снежня 1935 г., падчас абследаванняў «насельніцтва баіцца сказаць сваю нацыянальнасць – польскую ці беларускую». Вывучаліся рашэнні раённых і іншых органаў, пастановы сходаў, дакументы і матэрыялы аб нацыянальным складзе насельніцтва, на падставе якіх былі ўтвораны нацыянальныя саветы. Асабліва пільная ўвага была звернута на польскія сельсаветы [0, арк. 332, 335, 326].

Да ліпеня 1937 г. адказныя і кіраўнічыя работнікі не адмаўлялі магчымасці існавання нацыянальных саветаў у месцах кампактнага пражывання палітычна лаяльнага насельніцтва, якое адрознівалася высокім узроўнем нацыянальнай самасвядомасці і актыўна выкарыстоўвала мову сваёй нацыянальнасці ў штодзённым жыцці [0, арк. 9–12], а ў выпадку рэарганізацыі (ліквідацыі) нацыянальных саветаў патрабавалі ад раённых улад абслугоўвання латышоў, яўрэяў, палякаў і г.д. на іх роднай мове «ў саветах, школах, дамах сацкультуры, калгасах і інш.». Падчас кожнага перагляду сеткі нацыянальных саветаў улады знаходзілі прычыны, каб некаторыя саветы пакінуць нерэарганізаванымі [0, арк. 106–140 зв.; 0, арк. 21].

Вынікі абследавання нацыянальных саветаў разглядаліся на сумесных пасяджэннях Бюро РК КП(б)Б і Прэзідыума РВК альбо партгрупы Прэзідыума ЦВК БССР. Паводле рашэнняў РК КП(б)Б і Прэзідыума РВК альбо высноў праверачных камісій (у асобных выпадках – сходаў грамадзян) ЦК КП(б)Б зацвярджаў альбо адхіляў пастановы аб ліквідацыі ці рэарганізацыі саветаў у беларускія. Затым адпаведныя пастановы выносіліся Прэзідыумам ЦВК БССР (з 20 ліпеня 1938 г. – Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР). Так, ужо 29 кастрычніка 1934 г. Прэзідыум ЦВК БССР рэарганізаваў Нова-Малыніцкі польскі сельсавет у беларускі і ліквідаваў Падасоўскі і Рудня-Нісімкавіцкі польскія сельсаветы Чачэрскага раёна [0, арк. 34].

Па выніках тэндэнцыйных абследаванняў насельніцтва большасці польскіх сельсаветаў было аднесена да беларусаў ці «былых палякаў». Калі па пэўнай мясцовасці былі атрыманы супярэчлівыя дадзеныя, то назначалася новая праверка альбо да ўвагі прымаліся лічбы з найменшай колькасцю палякаў. Так, 5 мая 1936 г. Бюро ЦК КП(б)Б рэарганізавала Бараўскі, Негарэльскі, Рубілкаўскі, Нава-

садскі, Нарэйкаўскі, Фаніпальскі, Сталінскі польскія сельсаветы Дзяржынскага раёна ў беларускія на падставе дадзеных пашпартызацыі 1935 г., згодна з якімі колькасць палякаў вагалася ў межах 15,3–31,6%. У той жа час у абследаванні, праведзеным інструктарам Аддзела Нацыянальнасцей пры Прэзідыуме ЦВК БССР Я. Я. Вонсакам, удзельная вага палякаў ацэньвалася ў 34–61% [0, арк. 79–102; 0, арк. 173–187].

Былі ліквідаваны дробныя і цераспалосна размешчаныя нацыянальныя саветы. Так, 29 кастрычніка 1934 г. шэраг аддаленых ад цэнтра мясцовасцей Грудзінаўскага латышскага сельсавета быў далучаны да суседніх беларускіх сельсаветаў. 24 студзеня 1939 г. Грудзінаўскі латышскі сельсавет быў аб’яднаны з Грудзінаўскім беларускім [0, арк. 32–34]. Рэарганізацыя 29 кастрычніка 1934 г. Унаўскага латышскага савета ў беларускі абгрунтоўвалася актыўным выкарыстаннем латышамі рускай і беларускай моў у публічным і прыватным жыцці [0, арк. 137].

Галоўнай прычынай непаслядоўнасці рэспубліканскіх улад у нацыянальным пытанні з’яўлялася супярэчлівая пазіцыя саюзнага кіраўніцтва. Работа сярод польскага і нямецкага насельніцтва БССР неаднаразова разглядалася ў Палітбюро ЦК УКП(б), Прэзідыуме Савета Нацыянальнасцей ЦВК СССР, УЦСПС і Камзеце. Звароты Бюро ЦК КП(б)Б з просьбай санкцыянаваць рэарганізацыю Дзяржынскага раёна ў беларускі, накіраваныя ў ЦК УКП(б) у снежні 1934 г., 2 снежня 1935 г. і 19 кастрычніка 1936 г., былі пакінуты без адказу [0, арк. 2–2 зв.; 0, арк. 7, 91–93].

У чарнавым варыянце пастановы Бюро ЦК КП(б)Б «Па выніках праверкі партыйных дакументаў па Дзяржынскай партарганізацыі» ад 19 снежня 1935 г. адзначалася, што пад выглядам барацьбы з «гвалтоўнай паланізацыяй» РК КП(б)Б закінуў польскую работу і імкнецца ліквідаваць польскі раён, аднак у канчатковым тэксце пастановы ўказвалася на неабходнасць далейшай барацьбы з «гвалтоўнай паланізацыяй беларускіх дзяцей у польскіх школах» і ліквідацыі Дзяржынскага польскага раёна [0, арк. 194 зв.; 0, арк. 26].

З другой паловы 1937 г. саюзныя ўлады паслядоўна прытрымліваліся курсу на ліквідацыю ўстаноў і арганізацый нацыянальных меншасцей, аб’яўленых асяродкамі «буржуазна-нацыяналістычнага ўплыву» і ізаляцыі працоўных ад рускага насельніцтва і савецкага будаўніцтва. У пастанове ЦК УКП(б) «Аб кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі» ад 27 ліпеня 1937 г. партыйным арганізацыям БССР прапаноўвалася ажыццявіць «хуткую ліквідацыю наступстваў шкодніцтва польскіх шпіёнаў» сярод былога кіраўніцтва БССР. Накіраваная ў БССР камісія па праверцы рэспубліканскай партыйнай арганізацыі ў складзе Г. М. Малянкова і Я. А. Якаўлева зусім не арыентавалася ў рэаліях нацыянальнага жыцця ў БССР (так, Я. А. Якаўлеў памылкова меркаваў, што ў Дзяржынскім раёне ў 1937 г. большасць школ працавала на польскай мове і не рэагаваў на апраўдальныя тлумачэнні былога сакратара Дзяржынскага РВК Дамыроўскага) [0, арк. 43].

28 ліпеня 1937 г. пастановай Бюро ЦК КП(б)Б «Аб ліквідацыі палітыкі паланізацыі» Дзяржынскі раён быў падзелены паміж суседнімі як асяродак антысавецкай барацьбы і непатрэбная адзінка ў адміністрацыйна-гаспадарчых адносінах (у 1938–1939 гг. Дзяржынскі раён быў адноўлены ў складзе Мінскай вобласці). У жніўні – верасні 1937 г. польскія сельсаветы былі рэарганізаваны ў беларускія (сцвярджалася, што яны былі «ўтвораны штучна, у шкодніцкіх мэтах і насуперак жаданню насельніцтва») [0, арк. 59–60].

Працэс ліквідацыі яўрэйскіх і іншых саветаў паскорыўся з прыняццем пастановы Бюро ЦК КП(б)Б «Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы» ад 3 ліпеня 1938 г. Падчас рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных саветаў у лістападзе 1938 г. – студзені 1939 г. СНК БССР спасылаўся на «хадайніцтвы грамадзян», савецкіх органаў раённага і абласнога ўзроўню і звесткі рэферэнта адміністрацыйнага падзелу пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР. Нашыя архіўныя пошукі не дазваляюць пацвердзіць існаванне хадайніцтваў насельніцтва ў падтрымку рэарганізацыі нацыянальных саветаў. Так, жыхары Падабранскага яўрэйскага местачковага савета выказаліся супраць яго рэарганізацыі ў беларускі [0, с. 44].

У асобных саветах у выніку рэпрэсій, высялення «кулацкіх элементаў», адміністрацыйна-тэрытарыяльных змен, выезду насель-

ніцтва на работу ў прамысловыя цэнтры доля нацыянальных меншасцей істотна зменшылася (у Вацлаваўскім і Галіцка-Мызскім латышскіх сельскіх саветах – да 33% і 35% адпаведна). Аднак калі ў Кубліцкім, Ушацкім, Ульскім, Раснянскім яўрэйскіх мястэчковых саветах працэнт яўрэяў зменшыўся істотна, то ў Падабранскім, Ляднянскім, Калышкаўскім яўрэйскіх местачковых саветах захоўвалася яўрэйская большасць [0, арк. 8–12, 26–37]. Перавод адміністрацыйна-гаспадарчага апарату, школ, культурных устаноў на рускую (беларускую) мову, распаўсюджванне сярод насельніцтва рускіх (беларускіх) газет рабілі існаванне нацыянальных саветаў немэтазгодным. Так, 20 красавіка 1939 г. быў ліквідаваны апошні ў БССР нацыянальны савет – Малькаўскі літоўскі сельсавет па прычыне пераводу на беларускую мову савецкага і гаспадарчага апарату і рэарганізацыі літоўскай няпоўнай сярэдняй школы ў беларускую ў 1938 г. (літоўцы складалі 81,5% насельніцтва сельсавета) [0, арк. 2].

**Заключэнне.** Першыя выпадкі рэарганізацыі і ліквідацыі польскіх і яўрэйскіх саветаў мелі месца падчас актыўнай культурнай і гаспадарчай работы сярод нацыянальных меншасцей у другой палове 1920-х гг. Да сярэдзіны 1930-х гг. савецкае кіраўніцтва прыйшло да высновы аб тым, што стварэнне нацыянальных саветаў і раёнаў садзейнічала канцэнтрацыі «антысавецкіх сіл» і перашкаджала працэсам асіміляцыі нацыянальных меншасцей, якая была аб’яўлена прагрэсіўнай і заканамернай з’явай. Дадатковымі прычынамі рэарганізацыі (ліквідацыі) нацыянальных саветаў з’яўляліся пашырэнне рускай (беларускай) мовы сярод нацыянальных меншасцей, перавод работы дзяржаўных устаноў на рускую (беларускую) мову, змяншэнне долі небеларускага насельніцтва, неабходнасць ліквідацыі дробных і цераспалосна размешчаных адміністрацыйных адзінак.

Пачатак перагляду сеткі нацыянальных саветаў у БССР звязаны з палітычнай кампаніяй супраць «паланізацыі» беларускага насельніцтва, разгорнутай пасля прыняцця пастановы ЦК УКП(б) «Аб рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР» ад 26 ліпеня 1934 г. У кастрычніку 1934 г. – першай палове 1937 г. працэс рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных саветаў не меў усёабдымнага маштабу. Адказныя і кіраўнічыя работнікі не адмаўлялі магчымасці існавання нацыянальных саветаў у месцах кампактнага пражывання палітычна лаяльнага насельніцтва з высокім узроўнем нацыянальнай самасвядомасці, якое актыўна выкарыстоўвала мову сваёй нацыянальнасці ў штодзённым жыцці.

Пасля выхаду 27 ліпеня 1937 г. пастановы ЦК УКП(б) «Аб кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі» савецкая ўлада перайшла да канчатковай ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у БССР. Тэрыторыя Дзяржынскага польскага раёна была падзелена паміж суседнімі раёнамі. У ліпені – верасні 1937 г. былі рэарганізаваны (ліквідаваны) апошнія польскія саветы. Працэс ліквідацыі яўрэйскіх сельскіх і местачковых саветаў паскорыўся з прыняццем пастановы Бюро ЦК КП(б)Б «Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы» ад 3 ліпеня 1938 г. Апошні нацыянальны савет быў ліквідаваны ў красавіку 1939 г.

**Спіс літаратуры**

1. Валаханович, А. И. Дзержинск : историко-экономический очерк / А. И. Валаханович. – Минск : Беларусь, 1982. – 78 с.
2. Головко, А. А. Конституция подлинного народовластия / А. А. Головко. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1979. – 30 с.
3. Залесский, А. И. О национальных отношениях в Советской Белоруссии / А. И. Залесский. – Гродно : ГрГУ, 1992. – 193 с.
4. Административно-территориальное устройство БССР : справочник : в 2 т. – Минск : Беларусь, 1985–1987. – Т. 1 : 1917–1941 гг. / сост. Т. А. Воробьева, С. Д. Гриневич, А. И. Карпачева. – 1985. – 390 с.
5. Вялікі, А. Крах «польскага эксперымента» / А. Вялікі // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 6. – С. 48–51.
6. Тугай, У. В. Польскія нацыянальныя саветы на Беларусі (20–30-я гг. XX ст.) / У. В. Тугай // XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў : мат-лы бел.-пол. Навук. Канф., Мінск, 20–21 лістап. 2000 г. / рэдкал.: У. Міхнюк, П. Гарнцарэк (адк. Рэд.) і інш. – Warszawa – Мінск, 2001. – С. 184–189.
7. Королёв М. Латышские национальные сельсоветы как явление в национальной

политике БССР / М. Королёв // Латыши и белорусы: вместе сквозь века. – 2017. – Вып. 6. – С. 30–37.
8. Малые диаспоры Гомельщины в 20–30-е годы XX века : аналитические материалы и документы Государственного архива Гомельской области / под ред. В. П. Пичукова. – Гомель : Гом. Гос. Техн. Ун-т, 2008. – 250 с.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7738.
10. Нурмаков, Н. Н. III Всероссийское совещание работников среди национальных меньшинств / Н. Н. Нурмаков // Революция и национальности. – 1934. – № 1. – С. 80–86.
11. Поташ, М. К. 14-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў / М. К. Поташ // Бальшавік Беларусі. – 1934. – № 13–14. – С. 98–115.
12. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9149.
13. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9152.
14. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7798.
15. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7196.
16. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9192.
17. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9180.
18. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 8945.
19. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13127.
20. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9144.
21. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7790.
22. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9172.
23. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7816.
24. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11033.
25. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11005.
26. Гомельская область, 1938–1941 гг.: документы и материалы / редкол.: В. И. Адамушко и др. – Минск : НАРБ, 2013. – 214 с.
27. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13127.
28. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 14487.

**References**

1. Valakhanovich A. I. *Dzerzhinsk : istoriko-ekonomicheskyy ocherk* [Dzerzhinsk : historical and economic essay]. Minsk, Belarus, 1982. 78 p.
2. Golovko A. A. *Konstitutsiya podlinnogo narodovlastiya* [The Constitution of a Genuine Democracy]. Minsk, Izd-vo BGU im. V. I. Lenina, 1979. 30 p.
3. Zalesskyy A. I. *O natsionalnykh otnosheniyakh v Sovetskoy Belorussii* [About the national relations in the Soviet Byelorussia]. Grodno, GrGU, 1992. 193 p.
4. Vorob'eva T. A. *Administrativno-territorialnoe ustroystvo BSSR* : *spravochnik. Tom 1. 1917–1941 gg.* [Administrative-territorial structure of the BSSR : reference book. Vol. 1. 1917–1941]. Minsk, Belarus, 1985. 390 p.
5. Vyaliki, A. *Krakh «polskaga eksperymenta»* [The collapse of the «Polish experiment»]. *Belaruskaya minuushchyna* [The Belarusian past], 1996, no. 6, pp. 48–51 (In Belarusian).
6. Tugay U. V. *Polskiya natsyyanalnyya savety na Belarusi (20–30-ya gg. XX st.)* [The Polish National Councils in Belarus (20–30s of the XXth century)]. *XX stagoddze u gistoryi palyakau i belarusau* [XX century in the history of Poles and Belarusians]. Ed. U. Mihnyuk, P. Garntsarek et al. Warszawa, Minsk, 2001, pp. 184–189 (In Belarusian).
7. Korolyov M. *Latyshskie natsionalnye selsovety kak yavlenie v natsionalnoy politike BSSR* [The Latvian National Village Councils as a phenomenon in the national policy of the BSSR]. *Latyshi i belorusy: vmeste skvoz veka* [The Latvians and the Belarusians: together through the ages], 2017, no. 6, pp. 30–37 (In Russian).
8. *Malye diaspory Gomelshchiny v 20–30-e gody XX veka : analiticheskie materialy i dokumenty Gosudarstvennogo arkhiva Gomelskoy oblasti* [Small diasporas of the Gomel region in the 20–30s of the XX century : the analytical materials and documents of the State Archive of the Gomel region] / Ed. V. P. Pichukov et al. Gomel, Gom. gos. tehn. un-t, 2008. 250 p.
9. *Natsyyanalny arkhiu Respubliki Belarus (NARB) [National Archive of the Republic of Belarus].* Fund 4p. I. 1. F. 7738.
10. Nurmakov N. N. *III Vserossiyskoe soveshchanie rabotnikov sredi natsionalnykh menshinstv* [IIIrd All-Russian meeting of workers among the national minorities]. *Revolyutsiya i natsionalnosti* [Revolution and nationalities], 1934, no. 1, pp. 80–86 (In Russian).
11. Potash M. K. *14-goddzyu vyzvalennya BSSR ad belapalyakau* [To the 14th anniversary of the liberation of the BSSR from the White Poles]. *Balshavik Belarusi* [Bolshevik of Belarus], 1934, no. 13–14, pp. 98–115 (In Belarusian).
12. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9149.

13. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9152.
14. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7798.
15. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7196.
16. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9192.
17. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9180.
18. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 8945.
19. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 13127.
20. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9144.
21. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7790.
22. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9172.
23. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7816.
24. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 11033.
25. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 11005.
26. *Gomelskaya oblast, 1938–1941 gg.: dokumenty i materialy* [Gomel region, 1938–1941: documents and materials] / Ed. V. I. Adamushko et al. Minsk, NARB, 2013. 214 p.
27. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 13127.
28. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 14487.

*Received 3 May 2023*